*І. І. ЛЯНЬКОЎ*

# РАШЭННІ І ПРАБЛЕМЫ ПАЧАТКОВАЙ СТАДЫІ РЭФАРМАВАННЯ АПК

У сучасны момант рэфармаванне сельскагаспадарчых і іншых прадпрыемстваў АПК уступае ў стадыю практычнай рэалізацыі важнейшых складаючых аграрнай рэформы. Гутарка ідзе пра змяненне адносін па ўласнасці, якія вызначаюць як змест вытворчых адносін, так і якасныя характарыстыкі вытворчых сілаў. Усе гэтыя змены накіраваны на ажыццяўленне пераўтварэнняў у механізме ўзаемаадносін чалавека са сродкамі і прадметамі працы, якія закліканы істотна павысіць матывацыі да высокапрадукцыйнай працы як асобных працаўнікоў, так і калектываў. Змены адносін па ўласнасці, выражэннем якіх з'яўляецца ператварэнне наёмнага рабочага ва ўласніка, стварае матэрыяльную базу новай сістэмы размеркавання прыбавачнага прадукту. Адрознай асаблівасцю гэтай новай сістэмы з'яўляецца права таваравытворцы

на прысваенне асноўнай часткі прыбавачнага прадукту. Па сутнасці, фарміраванне новага ўласніка змяняе як пабуджальныя матывы вытворчасці, так і механізм размеркавання яго вынікаў. Адсюль вынікае, што змест раздзяржаўлення і прыватызацыі як аднаго з важнейшых спосабаў стварэння, шматлікага слоя ўласнікаў з'яўляецца асноватворным элементам усёй будучай сістэмы вытворчасці. А гэта значыць, што ажыццяўленне працэсу раздзяржаўлення і прыватызацыі павінна быць у цэнтры ўвагі дзяржавы, вучоных, спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

Важнасць праблемы заключаецца ў тым, што ў залежнасці ад накіраванасці працэсу раздзяржаўлення і прыватызацыі ступень удзелу насельніцтва ў фарміраванні рыначнай сістэмы гаспадарання будзе не аднолькавай. А гэта абазначае адрозненні як у сацыяльным асяроддзі рынку, так і ступені падтрымкі насельніцтвам рыначных пераўтварэнняў.

Галоўныя адрозненні ў сутнасці рэфармавання ўласнасці праяўляюцца ў двух аспектах: па-першае, у складзе ўдзельнікаў гэтага працэсу і, па-другое, у ступені і характары размеркавання маёмасці.

Абагульняючы розныя падыходы, можна вылучыць тры асноўныя варыянты па вызначэнні складу ўдзельнікаў: зараз працуючыя; зараз працуючыя, работнікі невытворчай сферы і дзяржава і, нарэшце, замацаванне маёмасці за абмежаванай групай асоб, якія называюцца найбольш актыўнай часткай калектываў.

Пры вырашэнні праблемы катэгорый удзельнікаў раздзяржаўлення і прыватызацыі трэба, на наш погляд, кіравацца асноватворнымі прынцыпамі: правам па атрыманне маёмаснага паю дае працаўнікам выключна іх працоўная дзейнасць. Адсюль удзельнікамі раздзяржаўлення і прыватызацыі павінны з'яўляцца зараз працуючыя і пенсіянеры, а таксама асобы, якія пакінулі гаспадарку на працягу апошніх 3—5 гадоў па ўважлівай прычыне, або наследнікі, якія маюць дакументы пра ўнясенне маёмаснага або грашовага ўзносу іх папярэднікамі.

Правамернасць удзелу ў раздзяржаўленні працаўнікоў невытворчай сферы, г. зн. адукацыі, аховы здароўя і г. д., тлумачыцца, на наш погляд, тым, што ўсе яны апасродкавана, праз падрыхтоўку кадраў, ахову здароўя людзей робяць уплыў на выніку вытворчасці. Выдзяленне працаўнікам гэтай сферы маёмаснага паю сельскагаспадарчых прадпрыемстваў стварае больш шырокую падтрымку рыначных пераўтварэнняў, будзе садзейнічаць замацаванню кадраў дэфіцытных прафесій на сяле.

Выдзяленне часткі маёмасці дзяржаве ў асобе мясцовых органаў улады правамерна таму, што, па-першае, дзяржава ў гэтым выпадку будзе акумуляваць маёмасць, створаную працаўнікамі мінулых пакаленняў, або тых, хто страціў усякую сувязь з гаспадаркай; па-другое, з-за сістэматычнай матэрыяльнай і фінансавай падтрымкі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў з боку дзяржавы; па-трэцяе, для стварэння матэрыяльнай асновы сістэмы мясцовага самакіравання.

Сутнасць праблемы заключаецца ў тым, што ва ўмовах функцыянавання сістэмы мясцовага самакіравання наяўнасць у яе часткі маёмасці, а значыць, і акцый размешчаных на дадзенай тэрыторыі сельгаспрадпрыемстваў, з'явіцца матэрыяльнай асновай для атрымання дывідэндаў і наступнага фарміравання бюджэту. Паколькі велічыня мясцовага бюджэту будзе вызначаць магчымасць вырашаць сацыяльныя праблемы дадзенай тэрыторыі, то мясцовыя органы ўлады будуць імкнуцца аказваць усялякую падтрымку прадпрыемствам у павелічэнні іх прыбытковасці.

Найбольш непрымальным з пункту погляду захавання прынцыпаў дэмакратычнай дзяржавы і мэтаў стварэння розных стартавых магчымасцяў ва ўмовах рыначнай сістэмы гаспадарання з'яўляецца зама-

цаванне маёмасці за найбольш актыўнай часткай калектыву. Пры наяўнасці суб'ектывізму ў вызначэнні ступені актыўнасці асобы цяжка згадзіцца з тым, што прыбытак у гэтым выпадку будзе размяркоўвацца прапарцыянальна ўкладу працаўнікоў у стварэнне канчатковага прадукту. Як правіла, большымі правамі будуць валодаць работнікі — уладальнікі маёмасці. Пагадненне паміж імі і астатнімі працуючымі, фактычна наёмнымі рабочымі, пра справядлівае размеркаванне прыбавачнага прадукту будзе часцей за ўсё часовым. У рэшце рэшт замацаваная за асобнымі работнікамі прадпрыемства маёмасць, якая належыць усяму калектыву, прывядзе да таго, што гэтыя асобныя работнікі гэтай маёмасцю ўрэшце і завалодаюць. У выніку будзе закладзена матэрыяльная доўгачасова дзеючая аснова сацыяльных канфліктаў. А гэта ў сваю чаргу падштурхоўвае да думкі, што распрацоўка якіх бы там ні было прапаноў па рэфармаванні сістэмы гаспадарання ў цэлым або асобных яе элементаў павінна суправаджацца прагнозам магчымых сацыяльна-эканамічных наступстваў. У сваю чаргу, каб падобны прагноз атрымаў пацвярджэнне, усякая прапанова па ўдасканаленні сістэмы гаспадарання павінна дапаўняцца механізмам яго рэалізацыі.

Узаемазвязаны характар усіх элементаў гаспадарчага механізма АПК паказвае на тое, што поспех любой прапановы па рэфармаванні залежыць ад мноства іншых фактараў і ўмоў. У роўнай ступені гэта датычыцца і фарміравання ўласнасці, наступствам якога ў канчатковым ліку павінна стаць павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і істотнае зніжэнне расходу рэсурсаў на адзінку прадукцыі, г. зн. рэсурса- і энергазберажэнне. Ажыццяўленне апошняга цесна звязана з канкурэнцыяй на ўсіх стадыях ад вытворцы да спажыўца. У нашых умовах асобае значэнне набывае канкурэнцыя на стадыі перапрацоўкі і рэалізацыі прадукцыі.

Паколькі стварэнне двух-трох розных па ўласнасці аднатыповых прадпрыемстваў-канкурэнтаў патрабуе значных сродкаў і часу, то зараз трэба было б увесці нарматывы затрат і нацэнак на прадукцыю на стадыі руху яе да пакупніка. Узмацненне рэгулюючай ролі дзяржавы ў гэтым выпадку рэзка скараціла б лік паралельных прамежкавых структур, якія штучна завышаюць цэны на прадукцыю і істотна зніжаюць канкурэнтаздольнасць сельскагаспадарчай і іншых відаў прадукцыі. Немалаважным для вырашэння гэтай праблемы з'явілася б ініцыіраванне дзяржавай стварэння сістэмы фірменных магазінаў. Першыя станоўчыя вынікі іх функцыянавання ўжо ёсць, аднак належных высноў і рашэнняў па інтэнсіўным паскарэнні гэтага працэсу пакуль няма.

Змены вытворчых адносін робяць непасрэдны ўплыў на прынцыпы і метадалогію навуковых даследаванняў. Па-першае, навуковыя даследаванні павінны быць зарыентаваныя на попыт вытворчасці. Канцэптуальнай асновай развіцця ўсіх накірункаў аграрнай навукі павінна з'яўляцца цесная ўзаемасувязь яе даследаванняў з патрэбамі і запатрабаваннямі вытворчасці. Неабходна распрацоўваць і ўжываць новыя метадалагічныя падыходы ў абгрунтаванні накірункаў выкарыстання і акупальнасці рэсурсаў, структурных зменаў у АПК па ўсіх аб'ектах даследавання аграрнай навукі і ў прыватнасці:

а) укараненне новай сістэмы гаспадарання прывядзе да істотнага павышэння акупальнасці рэсурсаў, у тым ліку мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы раслінаў. Мяркуюцца змены ў наменклатуры, якасных характарыстыках, у тэхналогіі вытворчасці і выкарыстання ўгнаенняў і сродкаў аховы раслінаў;

б) сельскагаспадарчая вытворчасць рынначнага тыпу адрозніваецца высокай прадукцыйнасцю працы. Адсюль чакаемае змяншэнне колькасці занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці працаўнікоў не трэба адназначна лічыць вынікам крызісу эканомікі. Змяншэнне колькасці

працуючых у сельскагаспадарчай вытворчасці павінна суправаджацца іх павелічэннем у сферы паслуг, перапрацоўкі і рэалізацыі;

в) рэфармаванне сельскай гаспадаркі мяркуе ў канчатковым выніку стварэнне прадпрыемстваў, розных па памерах, формах уласнасці, гаспадарання, інтэнсіўнасці. Адсюль неабходна ўлічваць адзначаныя тэндэнцыі пры распрацоўцы новых тэхналогій, сістэм машын і механізмаў для вытворчасці, захоўвання, перапрацоўкі і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Неабходна мець на ўвазе, што адрыў галіновых даследаванняў ад пераўтварэнняў у эканоміцы прывядзе да прынцыповых памылак у выбары прыярытэтаў, у змесне канцэпцый і метадалогій даследаванняў.